# No. 47794

# United Nations (United Nations High Commissioner for Refugees) and Belarus

**Agreement between the Office of the United Nations High Commissioner for Refugees and the Republic of Belarus on cooperation and the legal status of the Office of the United Nations High Commissioner for Refugees and its personnel in the Republic of Belarus. Minsk, 28 July 2010**

**Entry into force:** *provisionally on 28 July 2010 by signature, in accordance with article XVII*

**Authentic texts:** *Belarusian, English and Russian*

**Registration with the Secretariat of the United Nations:** *ex officio, 21 September 2010*

---

# Organisation des Nations Unies (Haut-Commissariat des Nations Unies pour les réfugiés) et Bélarus

**Accord entre le Haut-Commissariat des Nations Unies pour les réfugiés et la République du Bélarus relatif à la coopération et au statut légal du Haut-Commissariat des Nations Unies pour les réfugiés et son personnel dans la République du Bélarus. Minsk, 28 juillet 2010**

**Entrée en vigueur :** *provisoirement le 28 juillet 2010 par signature, conformément à l'article XVII*

**Textes authentiques :** *biélorusse, anglais et russe*

**Enregistrement auprès du Secrétariat des Nations Unies :** *d'office, 21 septembre 2010*

[ BELARUSIAN TEXT – TEXTE BIÉLORUSSE ]

# ПАГАДНЕННЕ
## паміж Упраўленнем Вярхоўнага камісара Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па справах бежанцаў і Рэспублікай Беларусь аб супрацоўніцтве і прававым статусе Прадстаўніцтва Упраўлення Вярхоўнага камісара Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па справах бежанцаў і яго персаналу ў Рэспубліцы Беларусь

З прычыны таго, што Упраўленне Вярхоўнага камісара Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па справах бежанцаў створана ў адпаведнасці з рэзалюцыяй Генеральнай Асамблеі Арганізацыі Аб'яднаных Нацый 319 (IV) ад 3 снежня 1949 года,

прымаючы пад увагу той факт, што Статут Упраўлення Вярхоўнага камісара Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па справах бежанцаў, які зацверджаны рэзалюцыяй Генеральнай Асамблеі Арганізацыі Аб'яднаных Нацый 428 (V) ад 14 снежня 1950 года, прадугледжвае, у прыватнасці, што Вярхоўны камісар Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па справах бежанцаў, які дзейнічае пад кіраўніцтвам Генеральнай Асамблеі Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, прымае на сябе абавязкі па забеспячэнню пад эгідай Арганізацыі Аб'яднаных Нацый міжнароднай аховы бежанцаў, што падпадаюць пад дзеянне названага Статута, а таксама па пошуку канчатковага рашэння праблемы бежанцаў шляхам аказання садзейнічання ўрадам і са згоды ўрадаў – прыватным арганізацыям для палягчэння добраахвотнай рэпатрыяцыі бежанцаў або іх асіміляцыі ў новых нацыянальных суполках,

з прычыны таго, што Упраўленне Вярхоўнага камісара Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па справах бежанцаў як дапаможны орган, створаны Генеральнай Асамблеяй Арганізацыі Аб'яднаных Нацый у адпаведнасці з артыкулам 22 Статута Арганізацыі Аб'яднаных Нацый ад 26 чэрвеня 1945 года, з'яўляецца неад'емнай часткай Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, статус, прывілеі і імунітэты якой вызначаны ў Канвенцыі аб прывілеях і імунітэтах Аб'яднаных Нацый, што прынята Генеральнай Асамблеяй Арганізацыі Аб'яднаных Нацый 13 лютага 1946 года,

прымаючы пад увагу намер Рэспублікі Беларусь і Упраўлення Вярхоўнага камісара Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па справах бежанцаў вызначыць умовы, на якіх Упраўленне Вярхоўнага камісара Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па справах бежанцаў у межах свайго мандата будзе прадстаўлена на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь,

улічваючы той факт, што артыкул 16 Статута Упраўлення Вярхоўнага камісара Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па справах бежанцаў прадугледжвае, што Вярхоўны камісар Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па справах бежанцаў кансультуецца з урадамі краін пастаяннага месцапражывання бежанцаў адносна неабходнасці назначэння ў гэтых краінах яго прадстаўнікоў і што ў кожнай краіне, якая прызнае ў гэтым

неабходнасць, можа быць прызначаны прадстаўнік, які зацвярджаецца ўрадам гэтай краіны,

прымаючы пад увагу той факт, што Рэспубліка Беларусь з'яўляецца ўдзельнікам Канвенцыі аб ахове персаналу Арганізацыі Аб'яднаных Нацый і звязанага з ёй персаналу, якая была прынята Генеральнай Асамблеяй Арганізацыі Аб'яднаных Нацый у г.Нью-Йорку 9 снежня 1994 года,

Упраўленне Вярхоўнага камісара Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па справах бежанцаў і Рэспубліка Беларусь у духу пазітыўнага супрацоўніцтва пагадзіліся аб ніжэйпададзеным:

## Артыкул I
## Азначэнні

У мэтах дадзенага Пагаднення выкарыстоўваюцца наступныя азначэнні:

a) УВКБ ААН – Упраўленне Вярхоўнага камісара Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па справах бежанцаў;

b) Вярхоўны камісар – Вярхоўны камісар Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па справах бежанцаў або службовыя асобы, якія ўпаўнаважаны Вярхоўным камісарам дзейнічаць ад яго імя;

c) Урад – Урад Рэспублікі Беларусь;

d) краіна знаходжання або краіна – Рэспубліка Беларусь;

e) Бакі – Рэспубліка Беларусь і УВКБ ААН;

f) Канвенцыя – Канвенцыя аб прывілеях і імунітэтах Аб'яднаных Нацый, прынятая Генеральнай Асамблеяй ААН 13 лютага 1946 года;

g) Прадстаўніцтва УВКБ ААН – арганізацыйныя падраздзяленні; усе памяшканні, будынкі і абсталяванне, якія займае або эксплуатуе УВКБ ААН у Рэспубліцы Беларусь;

h) Прадстаўнік УВКБ ААН – службовая асоба УВКБ ААН, якая кіруе Прадстаўніцтвам УВКБ ААН у Рэспубліцы Беларусь;

i) службовыя асобы УВКБ ААН – усе штатныя супрацоўнікі УВКБ ААН, якіх прынялі на працу ў адпаведнасці з правіламі і палажэннямі Арганізацыі Аб'яднаных Нацый аб кадравым забеспячэнні, за выключэннем асоб, якіх нанялі на працу пагадзінна на месцы ў адпаведнасці з рэзалюцыяй Генеральнай Асамблеі 76 (I);

j) камандзіраваныя эксперты – асобы, якія камандзіраваны для выканання даручэнняў УВКБ ААН, акрамя службовых асоб УВКБ ААН або асоб, што аказваюць паслугі ад імя УВКБ ААН;

k) асобы, што аказваюць паслугі ад імя УВКБ ААН, – фізічныя і юрыдычныя асобы і іх супрацоўнікі, якія не з'яўляюцца грамадзянамі

Рэспублікі Беларусь, нанятыя УВКБ ААН для ажыццяўлення ці аказання дапамогі ў выкананні праграм УВКБ ААН;

l) персанал УВКБ ААН – службовыя асобы УВКБ ААН, камандзіраваныя эксперты і асобы, якія аказваюць паслугі ад імя УВКБ ААН;

m) няўрадавыя арганізацыі – аб'яднанні, арганізацыі і фонды, якія не маюць ў якасці асноўнай мэты сваёй дзейнасці атрыманне прыбытку і не размяркоўваюць атрыманы прыбытак паміж удзельнікамі;

n) плата за аказаныя паслугі – плата за фактычна прадастаўленыя паслугі або рэсурсы, якія могуць быць дакладна ідэнтыфікаваны, апісаны ці пералічаны;

o) камунальныя паслугі – некаторыя рэсурсы ці паслугі, што прадастаўлены Рэспублікай Беларусь, аплата за якія ажыццяўляецца па ўстаноўленых цэнах (тарыфах) у адпаведнасці з аб'ёмам прадастаўленых рэсурсаў ці аказаных паслуг.

## АРТЫКУЛ II
## Мэта дадзенага Пагаднення

Дадзенае Пагадненне вызначае асноўныя ўмовы, на якіх УВКБ ААН у межах свайго мандата супрацоўнічае з Рэспублікай Беларусь, адкрывае і (або) забяспечвае дзейнасць свайго Прадстаўніцтва ці прадстаўніцтваў у Рэспубліцы Беларусь і ажыццяўляе функцыі па міжнароднай ахове і аказанню гуманітарнай дапамогі бежанцам і іншым асобам на тэрыторыі краіны знаходжання.

## АРТЫКУЛ III
## Супрацоўніцтва паміж Бакамі

1. Супрацоўніцтва паміж Бакамі па міжнароднай ахове і гуманітарнай дапамозе бежанцам і іншым асобам у межах кампетэнцыі УВКБ ААН ажыццяўляецца на падставе Статута УВКБ ААН і іншых рашэнняў і рэзалюцый устаноў Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, якія маюць дачыненне да УВКБ ААН, а таксама Артыкула 35 Канвенцыі аб статусе бежанцаў, што прынята 28 ліпеня 1951 года, і Артыкула II Пратакола, які тычыцца статусу бежанцаў, што прыняты 31 студзеня 1967 года.

2. Прадстаўніцтва УВКБ ААН праводзіць кансультацыі і ажыццяўляе супрацоўніцтва з Рэспублікай Беларусь пры падрыхтоўцы і разглядзе праектаў для бежанцаў і іншых асоб у межах кампетэнцыі УВКБ ААН.

3. Умовы супрацоўніцтва, уключаючы абавязацельствы Рэспублікі Беларусь і Вярхоўнага камісара аб прадастаўленні і выкарыстанні фондаў, рэсурсаў, абсталявання, аб аказанні паслуг ці іншай дапамогі бежанцам у межах кожнага праекта, які фінансуецца УВКБ ААН і ажыццяўляецца Рэспублікай Беларусь, агаворваюцца ў дадатковых пагадненнях паміж Бакамі.

4. Рэспубліка Беларусь абавязваецца ў любы час прадастаўляць персаналу УВКБ ААН бесперашкодны доступ да бежанцаў і іншых асоб у межах кампетэнцыі УВКБ ААН, а таксама да месцаў ажыццяўлення праектаў УВКБ ААН з мэтай кантролю за ўсімі стадыямі іх рэалізацыі.

## АРТЫКУЛ IV
## Прадстаўніцтва УВКБ ААН

1. Рэспубліка Беларусь падтрымлівае стварэнне і дзейнасць Прадстаўніцтва ці прадстаўніцтваў УВКБ ААН на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь для забеспячэння міжнароднай аховы і гуманітарнай дапамогі бежанцам і другім асобам у межах кампетэнцыі УВКБ ААН.

2. УВКБ ААН можа даручыць Прадстаўніцтву УВКБ ААН у Рэспубліцы Беларусь выкананне функцый рэгіянальнага (занальнага) Прадстаўніцтва.

3. Прадстаўніцтва УВКБ ААН ажыццяўляе функцыі, якія прадпісаны Вярхоўным камісарам у адпаведнасці з яго мандатам у адносінах да бежанцаў і іншых асоб у межах яго кампетэнцыі, уключаючы наладжванне і падтрыманне адносін з дзяржаўнымі органамі і няўрадавымі арганізацыямі, што дзейнічаюць у Рэспубліцы Беларусь.

## АРТЫКУЛ V
## Персанал УВКБ ААН

1.УВКБ ААН можа назначаць на працу ў Прадстаўніцтва УВКБ ААН у Рэспубліцы Беларусь для ажыццяўлення функцый міжнароднай аховы і гуманітарнай дапамогі таікх службовых асоб ці іншы персанал, які яно палічыць неабходным.

2. УВКБ ААН можа накіроўваць персанал УВКБ ААН у Рэспубліку Беларусь з мэтай правядзення кансультацый і супрацоўніцтва з адпаведнымі службовымі асобамі Рэспублікі Беларусь, дзяржаўнымі органамі і няўрадавымі арганізацыямі, якія ажыццяўляюць работу з бежанцамі, у сувязі:

а) з разглядам, падрыхтоўкай, кантролем і ацэнкай праграм міжнароднай аховы і гуманітарнай дапамогі;